УДК 316.624:070.446+316

***У.П. Люкевіч***

# ДЭВІЯНТНЫЯ ПАВОДЗІНЫ Ў СПОРЦЕ: ФІЛАСОФІЯ, СУТНАСЦЬ І НЕБЯСПЕКА ФУТБОЛЬНАГА ФАНАТЫЗМУ

Сучасны спорт у сістэме глабалізаванага грамадства ўяўляе сабой адмысловы феномен, які ўплывае на фармаванне грамадскіх адносінаў людзей, іх культуру, складае падставу паняцця «сацыяльны капітал». У той жа час у спорце шырока распаўсюджаныя дэвіянтныя паводзіны, рэгулярна здараюцця праявы расізму і ксенафобіі, дыскрымінацыі ў самых розных яе формах. На прыкладзе паводзінаў футбольных фанатаў аўтар аналізуе філасофскія аспекты дэгуманізацыйных тэндэнцый у спорце, іх сутнасць і небяспеку для сацыяльнага асароддзя.

## Уводзіны

Спорт у сучасную эпоху з выкарыстаннем і падтрымкай працэсаў глабалізацыі і рэгіяналізацыі ператварыўся ў складаны сацыякультурны феномен, які фармуе для сябе таксама гаспадарчую прастору, фінансава-эканамічную інфраструктуру, поле медыяльнага распаўсюджвання. Ягоны татальны ўплыў на грамадства ў цэлым і на чалавечую адзінку ў прыватнасці ствараюць уражанне ўзнікнення віртуальнай прасторы новай якасці. Гэта адбываецца незалежна ад існавання палітычных межаў і дзяржаўных фармаванняў, рэлігійнага веравызначэння, нацыянальнага паходжання і грамадскіх прыярытэтаў. Пачатак новага тысячагоддзя можа быць акрэслены як «залаты» перыяд у функцыянаванні і развіцці спорта, калі прыняць пад увагу тое, якое значэнне надаецца спартыўным спаборніцтвам featuring рознага ўзроўню, калі пачынаць ад лакальных турніраў і завяршаць найбольш значнымі, такімі, як, напрыклад, Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету і Еўропы па футболе, European Football Champions League.

Сацыяльны статус спорта з пункту гледжання шматкультурнасці, грамадскага капіталу і культурнага ўплыву на соцыўм па большасці яшчэ патрабуе шэрагу шматузроўневых даследаванняў, якія звязваюцца паміж сабой разнастайнымі параметрамі. Сярод іх можна вызначыць такія, як культурная стратыфікацыя, эканамічная мабільнасць, палітычны прэстыж, палітычная матывацыя, індывідуальныя амбіцыі і г.д. Аднак сучасны сацыякультурны працэс, які трапіў пад уплыў глабалізацыі, у суадносінах з працэсам рэгіяналізацыі ў сферы спорта падае досыць вялікую колькасць прыкладаў, што вымушаюць пераглядаць тыя стэрэатыпы, якія паўсталі ў гэтай галіне да апошняга часу. Як адзначае А. Класкоўска, калі сацыяльная рэчаіснасць стварае новыя механізмы сваёй дзейнасці, то яны з неабходнасцю павінны даследавацца [12].

Спорт канца мінулага стагоддзя і ў першае дзесяцігоддзе XX на падставе развіцця інфармацыйнага грамадства зрабіўся з’явай настолькі інтэрнацыянальнай, што паўплываў на размыццё дзяржаўных і культурных межаў. Міграцыя ў дапушчальных і недапушчальных памерах прывяла да таго, што сацыяльная дасведчанасць і фармаванне чалавечага капіталу ў цэлым стала суправаджацца, з аднаго боку, абвостраным успрыманнем старых этнічных і нацыянальных стэрэатыпаў, а з другога – фармаваннем новых ведаў і адносінаў.

Узнікае сітуацыя, калі этнічная і нацыянальная самасвядомасць з пункту гледжання на сваю чысціню, пачынае фактычна разбурацца пад уплывам вонкавага ціску. Феномен прафесійнага спорту здолеў зрабіць за даволі кароткі час тое, пра што марылі даўным-даўно стваральнікі і абаронцы прынцыпу ўніверсалізма, які коратка

можа быць выкладзены наступным чынам: усе людзі ёсць людзьмі ў поўнай і аднолькавай ступені.

Спорт з’яўляецца важным элементам у сістэме дзейнасці краінаў Еўрапейскага саюзу. Ён паўстае як фактар збліжэння паміж людзьмі, а таксама далучаецца да павелічэння ступені сацыяльнай інтэграцыі. Пра грамадскія функцыі спорту нагадвае дэкларацыя ў якасці дадатку да Амстэрдамскага трактату 1997 года, дзе падкрэсліваецца роля, якую спорт выконвае ў працэсе фармавання пачуцця самасвядомасці і аб’ядннаня людзей.

Спорт можа служыць эфектыўным сродкам інтэграцыі насельніцтва ў грамадстве, ён дапамагае развіваць такія здольнасці і якасці, як групавое ўзаемадзеянне, талерантнасць, сумленнае спаборніцтва. Спорт выконвае значную ролю ў барацьбе з расізмам і ўсялякага роду дыскрымінацыяй. Гэта адносіцца таксама да дыскрымінавання адносна полу, расы, сацыяльнага паходжання, рэлігійнага веравызнання, эканамічнага становішча, фізічных і разумовых неадпаведнасцяў, узросту, сексуальнай арыентацыі. Усё больш часта ўлічваецца значэнне спартыўнай дзейнасці як фактара, які палягчае інтэграцыю грамадства з імігрантамі, а таксама як каталізатара міжкультурнага дыялогу [2].

Такое разуменне спорту дазваляе інтэрпрэтаваць яго вельмі набліжана да паняцця «сацыяльны капітал», якое было ўведзена напрыканцы XX стагоддзя гарвардскім палітолагам Робертам Путнамам для абазначэння сеткі спантанных сувязяў і ўзаемнага даверу, якія ствараюць варункі спрыяльнага функцыянавання сучаснага грамадства. Выразам багатага сацыяльнага капіталу з’яўляецца самаарганізаванне людзей, утварэнне шматлікіх сяброўскіх супольнасцяў, клубаў, таварыстваў, якія разам мабілізуюцца да рэалізацыі нейкіх важных для сябе справаў, узаемнай дапамогі, а таксама з мэтамі рэкрэацыі, адпачынку і сумеснай забавы [12, s. 222].

Разам з тым сучасная спартыўная сацыякультурная рэчаіснасць непарыўна звязаная з тым, што ў гэтае ўтварэнне дадаюцца такія складальнікі, як расізм, ксенафобія, рэлігійная неталерантнасць, сацыяльная агрэсія, ідэялагічная несумяшчальнасць, што па большасці маюць адносіны да праблемаў эканамічнага характару, складанасцяў культурнай адаптацыі, неадэкватнасці запатрабаванняў на падставе нізкага сацыяльнага ўзроўню, адсутнасці адпаведнага адукацыйнага пазёму.

У выніку вартым аналізу падаецца спроба абазначыць некаторыя тэндэнцыі, якія вызначаюцца ў структуры фармавання сацыяльнага і культурнага капіталу праз і за пасярэдніцтвам спорту. Першапачатковай падставай у дадзеным падыходзе з’яўляецца тое, што спорт у сілу татальнасці свайго распаўсюджвання ўплывае на шырокія колы публічнасці, змест і вынікі спартыўнай дзейнасці адбіваюцца на ўспрыманні больш шырокіх сацыяльных асацыяцыяў, а самі заняткі спартыўнай дзейнасцю даволі часта становяцца прадметам абмеркавання іх фінансавай паспяховасці.

Акрамя таго, міграцыйныя тэндэнцыі ў сучасным глабалізацыйным грамадстве прывялі да сацыяльнай канфрантацыі паміж аўтахтонным насельніцтвам і перасяленцамі. Канфлікты, якія пераважна маюць эканамічную падставу, тычацца лепшых месцаў працы, больш камфортнага і якаснага ўзроўню жыцця, перспектываў далейшага развіцця. Спорт у дадзенай сітуацыі з’яўляецца адной з нешматлікіх магчымасцяў дасягнуць у адносна кароткі час пэўнай стабілізацыі. Але разам з тым структурныя элементы, якія фармуюць сацыяльны і культурны капітал, дапаўняюцца іншымі складальнікамі.

Працэс глабалізацыі ва ўзаемадзеянні з працэсам міграцыі пад уплывам феномена масавай культуры ў галіне прафесійнага спорту прывёў да ўсталявання новых стэрэатыпаў, якія моцна адбіліся на характарыстыцы паняцця «сацыяльны капітал». Калі браць за падставу канцэпцыю Роберта Путнама, то ў бягучы час

узнікаюць некаторыя сумненні адносна сутнаснай яе рэалізацыі ў сённяшняй рэчаіснасці. Так, існуе сетка спантанных сувязяў, але ці яны напоўненыя ўзаемным даверам, што адпавядае варункам спрыяльнага функцыянавання сучаснага грмамадства. Так, існуюць шматлікія групы сябраў, клубы, таварыствы, якія разам мабілізуюцца да рэалізацыі нейкіх важных для сябе справаў, узаемнай дапамогі ў самых разнастайных мэтах, але ці яны выяўляюцца прыяцельскімі ў адносінах паміж сабой. Ў спорце апошнім часам увага па-большасці акцэнтуецца на шэрагу праяваў нацыянальнай і рэлігійнай нецярпімасці, расізме, ксенафобіі, сацыяльнай агрэсіі.

З аднаго боку, спорт зараз з’яўляецца найбольш універсальнай мовай, што паяднoўвае народы незалежна ад расы, веравызнання ці сацыяльнага статусу, дзякуючы чаму ён паўстае як ідэальны спосаб ліквідацыі расізму, калі з дапамогай, напрыклад, футболу маладыя людзі могуць навучыцца талерантнасці, групавому супрацоўніцтву, дабрасумленнасці і павазе адносна іншых людзей, прадстаўнікоў розных нацыяў, рэлігіяў, рас і культураў.

Напрыклад, як адзначаў кіраўнік футбольнага клубу «Real» з Мадрыда Фернанда Марцін, у чэмпіянаце Іспаніі гуляюць «больш за сто футбалістаў, якія прадстаўляюць звыш трыццаць нацыянальнасцяў, – ад Аргенціны да Камеруна, ад Калумбіі да Філіпінаў, ад Румыніі да Польшчы, ад Марока да Кубы. Кожны з іх нечаму нас навучыў і адначасова наблізіў разуменне сутнасці *madridismo* (своеасаблівая філасофія клуба «Real» Мадрыд – У.Л.) да сваіх суайчыннікаў. Такое ўзаемапранікненне розных культураў развівае і ўзбагачае нашу гісторыю» [9].

Аднак, як паказвае аналіз падзеяў, што адбываюцца ў галіне спартыўнай дзейнасці, на самой справе ўсё выглядае некалькі інакш. Асабліва, калі размова ідзе аб адносінах да футбалістаў з чорным колерам скуры. Сапраўды, складаецца парадаксальная сітуацыя. Спартоўцаў з афрыканскіх краінаў, пераважна футбалістаў, даволі ахвотна запрашаюць багатыя еўрапейскія клубы, якія на сёння хутчэй выглядаюць як паспяховыя камерцыйныя мегапраекты. Яны з дапамогаў адмыслова падрыхтаваных скаўтаў шукаюць таленавітую моладзь па ўсім свеце. Афрыканскія краіны па шмат якіх крытэрыях з пункту гледжання пастаўкі на міжнародны рынак такога спецыфічнага «тавару» як мага лепш падыходзяць да гэтага адмысловага роду спартыўнага бізнэсу.

Вельмі шмат маладых людзей з краінаў так званага Трэцяга свету знаходзяцца ў варунках скрайняй галечы і адсутнасці жыццёвых перспектываў. Паглыбленне ўсё большай няроўнасці паміж кантынентамі вызначаецца беспасярэднім заняпадам пасля эпохі расісцкага каланіялізму, што і да цяперашняга часу ўплывае на лёсы мільёнаў людзей, якія пазбаўленыя элементарных сродкаў да існавання. Для некаторых з іх спорт з’яўляецца бадай адзінай магчымасцю ў дасягненні годнага жыцця. Гульня ў футбол у замежным клубе для шмат якіх афрыканцаў становіцца шанцам падтрымаць свае сем’і, якія застаюцца на радзіме.

Калі ўважліва прасачыць за краінамі паходжання чарнаскурых футбалістаў у еўрапейскіх клубах, то большасць з іх прадстаўляе тыя дзяржавы, якія, згодна класіфікацыі ААН, адносяцца да краін з нізкім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу і капіталу, маюць значныя эканамічныя праблемы, што выразна адбіваецца на культурна-адукацыйным узроўні саміх спартоўцаў (табліца). Прадстаўнікі Ганы, Камеруна, Кеніі, Нігерыі, Тога і г.д. гуляюць нярэдка ў самых знакамітых камандах і маюць шматмільённыя ганарары. Больш за тое, у выніку працэсу натуралізацыі яны выступаюць нават за нацыянальныя каманды шэрагу еўрапейскіх краінаў.

Табліца – Рэйтынг краін па Індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу [1]

| Вельмі высокі ўзровень | Высокі ўзровень | Сярэдні ўзровень | Нізкі ўзровень |
|---|---|---|---|
| 1. Нарвегія | 44. Літва | 86. Фіджы | 128. Кенія |
| 2. Аўстралія | 46. Аргенціна | 89. Кітай | 130. Гана |
| 3. Новая Зеландыя | 47. Латвія | 100. Манголія | 131. Камерун |
| 4. ЗША | 51. Харватыя | 101. Егіпет | 139. Тога |
| 5. Ірландыя | 53. Лівія | 106. Гандурас | 142. Нігерыя |
| 6. Ліхтэнштэйн | 58. Балгарыя | 110. ПАР | 144. Сенегал |
| 7. Нідэрланды | 60. Сербія | 119. Індыя | 149. Кот д'Івуар |
| 8. Канада | 61. Беларусь | 125. Пакістан | 151. Гамбія |
| 9. Швецыя | 64. Албанія | | 157. Эфіопія |
| 10. Германія | 65. Расія | | 162. Ліберыя |
| 13. Швейцарыя | 66. Казахстан | | |
| 14. Францыя | 69. Украіна | | |
| 18. Бельгія | 73. Бразілія | | |
| 19. Данія | 83. Турцыя | | |
| 20. Іспанія | | | |
| 23. Італія | | | |
| 40. Партугалія | | | |
| 41. Польшча | | | |

Такое становішча можна растлумачыць шерагам наступных фактараў.

1) Самі спартоўцы з афрыканскіх краінаў, – па сутнасці эмігранты-уцекачы з прычыны эканамічных цяжкасцяў, – за ўсялякі кошт імкнуцца трапіць у краіны з больш стабільнай сацыяльнай сістэмай.

2) Спорт для іх з'яўляецца фактычнай адзінай магчымасцю пазбегнуць галечы і «выбіцца ў людзі».

3) Яны складаюць вельмі сур'ёзную канкурэнцыю мясцовым спартоўцам зыходзячы з таго, што ігнаруюць шмат якія традыцыйныя еўрапейскія правілы і нормы, не цураюцца ўжываць допінг, а каштоўнасць свайго асабістага здароўя часта застаецца ў іх на другасным плане.

4) Сучасная сацыякультурная сітуацыя ў найбольш развітых краінах прывяла да ўспрымання спорту на ўзроўні відовішча, – нярэдка экстрэмальнага, – калі прасцей быць назіральнікам, чым удзельнікам.

5) Структурызацыя самаго спорту прывяла да выяўлення ў грамадскай думцы падзелу на спорт для багатых (гольф, кёрлінг, тэніс) і бедных (баскетбол, бокс, футбол), а таксама на прафесійны спорт, аматарскі спорт, спорт для ўсіх і камерцыйны спорт.

Сутыкненне эмігрантаў-спартоўцаў у новым для іх сацыякультурным асяроддзі з традыцыйнай сістэмай міжчалачечых адносінаў прывяло да негатыўнага успрымання гэтай катэгорыі з боку мясцовых заўзятараў, што выклікала новую хвалю расізма, ксенафобіі, рэлігійнай нецярпімасці і г.д.

У самым шырокім разуменні мэтаю спорта з'яўляецца паяднанне супольнасцяў і культураў, а таксама прапаганда здаровага і сумленнага спаборніцтва. Спорт дапамагае пераадолець абыякавасць, а нават і пагарду, якія даволі часта падзяляюць краіны і грамадствы. Выбар Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў якасці гаспадара Чэмпіяната свету па футболе 2010 года, дзяржавы, якая перамагла інстытуцыялізаваны расізм у выглядзе апартэіду, дэманструе выдатны прыклад для наступных намаганняў у барацьбе з дыскрымінацыяй ва ўсіх яе формах. Страх, адсутнасць талерантнасці і

ксенафобію можна пераадолець дзякуючы прынцыпам Fair play і ўзаемнаму супрацоўніцтву. Яны маюць найважнейшае значэнне ў такіх камандных гульнях, як футбол. Першынствы свету як мага лепш дэманструюць, што футбол можа аб'яднаць мільёны людзей на зямлі ў сумесным і радасным суперажыванні. Аднак трэба браць пад увагу праявы расізму і іншыя формы дэвіянтных адносінаў, якія атручваюць спорт, у прыватнасці футбол, ставяць пад сумненне яго пазітыўнае ўздзеянне і ствараюць дрэннае ўражанне на ягоны імідж. Даволі часта футбольныя фанаты камандаў-суперніцаў, каб вывесці з раўнавагі і атакаваць сваіх апанентаў, ужываюць абразлівыя словы і выразы, а часам дапускаюць гвалт. На жаль, нават самі спартоўцы нярэдка паводзяць сябе падобным чынам. Прафесійныя футбалісты павінны адпавядаць у сваіх паводзінах самым высокім спартыўным стандартам, якія сфармуляваныя згодна з этычнымі нормамі і прынцыпамі ў распрацаваным кодэксе FIFA, дзе маецца палажэнне аб недыскрымінацыі. Аднак можна налічыць нямала выпадкаў, калі багатыя клубы і арганізацыі пазбягалі суровых санкцыяў і плацілі смешна нізкія штрафы за сур'ёзныя расісцкія інцыдэнты пад час матчаў [10].

Праблемы падобнага кшталту характэрныя для сучаснага французскага футболу. Менавіта ў гэтай краіне ўтварылася сітуацыя, калі ўзніклі падазрэнні, што ў нацыянальнай зборнай існуе расавы парытэт. Журналісты распаўсюдзілі інфармацыю аб абмежаванні колькасці гульцоў афрыканскага паходжання. З прыватных крыніцаў у асяроддзі функцыянераў Французскага футбольнага саюзу стала вядома пра тое, што футбольныя школы і цэнтры падрыхтоўкі футбалістаў павінны прытрымлівацца правіла, згодна з якім удзел афрыканскіх (мараканскіх, алжырскіх і г.д.) спартоўцаў не перасягае 30%. Тэхнічны дырэктар зборнай Францыі па футболе Франсуа Блакарт публічна выказваў свае сумненні, якія датычацца футбалістаў нефранцузкага паходжання. Ён лічыць недапушчальным, калі пасля падрыхтоўкі ў Францыі такія гульцы маглі б выказаць жаданне выступаць за зборную краіны свайго паходжання. Праз некаторы час, па інфармацыі агенцтва Reuters Блакарт быў адпраўлены ў адстаўку [5].

Працэсы глабалізацыі і рэгіяналізацыі працягваюць дамінаваць па ўсім свеце. Апошнім часам яны моцна звязваюцца з міграцыйнымі плынямі, у тым ліку ў спорце. На прыкладзе футболу бачна, што ў еўрапейскіх камандах з'явілася вялікая колькасць спартоўцаў з азіяцкіх, афрыканскіх і паўднёваамерыканскіх краінаў. Маюцца яны таксама ў Польшчы, дзе практычна кожны клуб з першага дывізіёну карыстаецца паслугамі чарнаскурых гульцоў. На жаль, суровыя рэаліі жыцця такія, што гэтыя футбалісты сутыкаюцца з праявамі агрэсіі, расізму і ксенафобіі.

Так, Адэнійі Агбэюле, таленавіты форвард з Нігерыі, скардзіўся на тое, што на працягу чатырох гадоў праведзеных у Польшчы ў пяці розных клубах сутыкаўся з варожасцю. У камандзе «Odra» Аполе ён выступаў разам з камерунцам Адэкіе Мба. Аднойчы яны трапілі ў атачэнне скінхэдаў, якія ў прысутнасці трэнера пачалі крычаць: «Навошта прывозіш чорных у наш горад?!». Пазней у прысутнасці мноства сведкаў яго моцна збілі расісцка настроеныя фанаты клубу «Jagiellonia» Беласток: «Мой твар быў поўнасцю ў крыві. Сапраўды думаў, што мяне чакае смерць». А пад час матчу паміж футбольнымі камандамі ІІІ лігі першынства Польшчы «Jeziorak» Ілава і «Hutnik» Варшава арбітр, які абслугоўваў тую сустрэчу, калі падбег да чарнаскурага гульца, які ляжаў на траве пасля чарговага фолу, то запытаў яго: «Ну што, падымаешся, ці спачатку табе трэба даць банан?» [2].

На жаль, пералік падобных прыкладаў можна толькі павялічваць. Перад правядзеннем EURO-2012 можна з пэўнай доляй горычы канстатаваць, што польскія спартыўныя арэны, асабліва футбольныя стадыёны, сталі небяспечнымі месцамі, месцамі поўнымі агрэсіі, гвалту і нянавісці. Выразна бачыцца хваля расізму і шавінізму. На шмат якіх матчах на трыбунах з'яўляюцца сцягі з неафашысцкай

сімволікай, чуюцца антысяміцкія прыпеўкі і расісцкія лозунгі, якія накіраваныя галоўным чынам на гульцоў з Афрыкі.

Падобнае становішча прывяло да ўзнікнення антырасісцкага таварыства «Nigdy Więcej» («Ніколі Больш»), якое стала ініцыятарам кампаніі пад дэвізам «Павыбіваем расізм са стадыёнаў» з такімі мэтамі, як:

1) забарона расісцкай сімволікі на футбольных стадыёнах;

2) забарона расісцкіх выкрыкаў і лозунгаў;

3) утварэнне сеткі антырасісцкіх клубаў футбольных фанатаў;

4) распаўсюджванне сярод футбольных фанатаў нешавіністычных настрояў, каб быць адпорнымі да расізму [2].

Такія кампаніі ў Англіі, Германіі, Італіі, Нідэрландах і Шатландыі, якія праводзіліся сумесна футбольнымі клубамі, грамадскімі арганізацыямі і самімі футбольнымі фанатамі, мелі вялізарны ўплыў на памяншэнне лічбы расісцкіх інцыдэнтаў на стадыёнах і садзейнічалі распаўсюджванню талерантнасці сярод заўзятараў.

Улады Еўрапейскага саюзу надаюць пільную ўвагу спорту і ўважліва сочаць за тымі падзеямі, якія адбываюцца ў гэтай галіне. Так, у ліпені 2007 года Еўрапейская камісія апублікавала Белую кнігу на тэму спорта, у якой былі пазначаны некалькі актуальных пытанняў:

1) звернута ўвага на выкарыстанне ўнійных праграмаў, такіх як «Прагрэс», «Навучанне праз жыццё», «Моладзь у дзеянні», «Еўропа як для грамадзянаў, так і для Еўрапейскай супольнай фундацыі», «Еўрапейская фундацыя рэгіянальнага развіцця» і «Еўрапейская фундацыя інтэграцыі» у мэтах паглыблення сацыяльнай інтэграцыі, а таксама барацьбы з дыскрымінацыяй у спорце;

2) зроблена спроба садзейнічаць заахвочванню дыялогу, а таксама абмену найлепшай дасведчанасцю ў барацьбе з расізмам і ксенафобіяй;

3) зроблена спроба садзейнічаць заахвочванню мульцідысцыплінарнага падыходу ў супрацьдзеянні з асацыяльнымі паводзінамі, асабліва падкрэслена сацыяльна-адукацыйнае ўздзеянне, напрыклад, доўгатэрміновая праца з футбольнымі фанатамі, якая фармуе пазітыўнае стаўленне да вынішчэння гвалту ў спорце;

4) прапанавана ўзмацненне рэгулярнай і структурнай працы паміж службамі правапарадку, спартыўнымі арганізацыямі і іншымі зацікаўленымі бакамі [2].

Апошнім часам улады Еўрапейскага саюзу працуюць над дакументамі адносна пераадолення расізму і ксенафобіі на тэрыторыі Уніі, што можа дазволіць згарманізаваць дзейнасць розных службаў і арганізацыяў у барацьбе з дыскрымінацыяй і ўвесці аднолькавы каталог санкцыяў супраць асобаў, якія парушаюць правы чалавека ў гэтай сферы.

Набліжэнне Чэмпіяната Еўропы па футболе 2012 года на стадыёнах Польшчы і Украіны прыцягвае да гэтй падзеі ўвагу не толькі з пункту зацікаўленасці заўзятараў спорту, сродкаў масавай інфармацыі, арганізатараў турыстычных паслугаў, дзелавых колаў і г.д. Да EURO-2012 актыўна рыхтуюцца службы аховы правапарадку ў абедзвюх краінах, прычым не выключана, што да іх на дапамогу прыедуць супрацоўнікі адмысловых падраздзяленняў з Велікабрытаніі, Нідэрландаў, Германіі, якія маюць вялікую дасведчанасць у дзейнасці супраць футбольных хуліганаў. Справа ў тым, што з урастаннем рэпрэсіяў супраць футбольных фанатаў з боку прадстаўнікоў аховы парадку павялічваецца незадаваленне найбольш актыўнай часткі заўзятараў, што можа прывесці да рэакцыі ў адказ пад час правядзення самаго першынства.

Такі сцэнар вельмі верагодны і ён абгрунтоўваецца шэрагам прычынаў. Найперш, гэта тое, што адносіны да найбольш актыўных заўзятараў з боку службаў аховы парадку разглядаецца як да патэнцыяльнай крыніцы ўзнікнення небяспечных праблемаў. Футбольныя фанаты ўспрымаюцца не як частка спартыўнай дзейнасці, якая

мае свае правы і ўплывае на вынік спаборніцтваў, а як магчымыя парушальнікі парадку і крыніца фінансавых штрафаў для сваіх клубаў. Шкада толькі, што практычна не даследуюцца вытокі ўзнікнення, развіцця, функцыянавання і распаўсюджвання футбольнай фан-культуры. Па другое, культ гвалту і расізм у спорце маюць доўгую гісторыю і звязваюцца з шэрагам розных іншых сацыяльных праблемаў у грамадстве. З практыкі футбольных матчаў агульнавядома, што акрамя тых заўзятараў, якія прыходзяць на стадыён з сем'ямі, дудкамі і шалікамі, практычна паўсюль маюцца футбольныя фанаты. Яны звычайна знаходзяцца на асобнай трыбуне і заўсёды падтрымліваюць сваю каманду з дапамогай разнастайных тэкставых і маляваных банераў, візуальных эфектаў, выкарыстоўваюць для ўпрыгожвання сектараў дробныя піратэхнічныя сродкі. Але менавіта яны ў сучасным футболе становяцца найбольш крыміналізаванай групай. Калі ў краінах Заходняй Еўропы ў асяроддзі актыўных заўзятараў футбольныя хуліганы з'яўляюцца маргінальнай меншасцю і аддзеленыя ад большасці заўзятараў-ультрас, то ў краінах Усходняй Еўропы менавіта хуліганы прадстаўляюць мэйнстрым. Галоўная небяспека, якая зыходзіць ад іх, – гэта расізм, які адкрыта праяўляецца на стадыёнах.

На Украіне пад маркай «патрыятызму» футбольныя хуліганы пад час матчаў рэгулярна вывешваюць банеры расісцкага зместу, кельцкія крыжы, разнастайныя сімвалы Вермахту. Расізм украінскіх футбольных хуліганаў быў заўважаны нават функцыянерамі UEFA [3]. Напярэдадні EURO-2012 сродкі масавай інфармацыі распаўсюджваюць звесткі пра тое, што чакаецца расісцкі турнір. У якасці прыкладаў прыводзяцца эпізоды з польскіх стадыёнаў. Пад час сустрэчы камандаў «Polonia» Варшава і «Arka» Гдыня быў вывешаны фашысцкі сцяг з сімвалам SS-Totenkopf. Антысяміцкія выбрыкі адзначаліся ў дэрбі Жэшува, калі заўлятары вывесілі карыкатуру габрэя з транспарантам «Смерць гарбатым насам». У Гданьску заўлятары мясцовай каманды «Lechia» дамагаліся ад кіраўніцтва клубу, каб сярод футбалістаў больш не было «каляровых» [7].

Нярэдка на футбольным полі адбываюцца сутычкі паміж гульцамі, якія паўстаюць на глебе міжрэлігійных канфліктаў. Так, нямецкі паўабаронца турэцкага паходжання з мадрыцкага клубу «Real» (!) Месут Эзіл быў выдалены з поля на прыканцы матчу ў адказ Суперкубка Іспаніі з камандай «Barcelona» за ўдзел у бойцы з іншымі футбалістамі. Па словах Эзіла выдаленне не мела пад сабой падставы, і ён паводзіў сябе менавіта так, таму што імкнуўся абараніць сваю рэлігію, бо сапернік абразіў іслам [8]. Гэтае паведамленне не засталося незаўважаным на інтэрнэт-форумах і выклікала шэраг часам супрацлеглых выказванняў:

1. «Спорт па-за рэлігіямі і ўсялякім цемрашальствам». Залатыя словы! Толькі чаму тады турак павінен цярпець абразы? Узровень культуры як раз і вызначаецца тым, у якой ступені ты паважаеш чужыя перакананні. Не гледзячы на залежнасць таго, падзяляеш ты іх альбо не. У іншым выпадку гэты чалавек – нікчэмнасць.

2. Прабачце, але мне таксама гэтыя чуркі не па душы. Душонкі ў іх ці што нейкія гнілаватыя. У вочы ўсміхаюцца, а адвернешся – кінжал узносяць. Са сваім статутам да чужога кляштару не падыходзь... [4].

Беларуская футбольная федэрацыя вось ужо больш за дваццаць гадоў уваходзіць у еўрапейскае і сусветнае супольніцтва. Наколькі беларускі футбол злучаецца з тымі асацыяльнымі тэндэнцыямі, якія шырока распаўсюджаныя за межамі нашай краіны? Ці можна сёння пабачыць на нашых стадыёнах свастыкі і кельцкія крыжы, пачуць праварадыкальныя лозунгі, убачыць праявы расізму і ксенафобіі?

На вялікі жаль можна ўзгадаць шэраг падобных праяваў. Так, 28 красавіка 2010 года на фанацкай трыбуне мінскага «Дынама» быў вывешаны банер з партрэтам Рудольфа Геса, партыйнага намесніка Адольфа Гітлера. Адбылося гэта пад час матча з

камандай ФК «Віцебск». Банер суправаджаўся надпісам «Тваё жыццё для нас – гэта вернасці прыклад». Інцыдэнт здарыўся за 11 сутак да Дня Перамогі. Клуб «Дынама» быў пакараны штрафам у 245 мільёнаў беларускіх рублёў (на той час каля 79 тысяч доларaў ЗША). Не менш гучны скандал здарыўся на хатнім стадыёне барысаўскага БАТЭ, калі невядомыя хуліганы пад час матча з ісландскім FH «Hafnarfjördur» (Рэйк'явік) узнялі шыльды з лічбамі 14 і 88 (спалучэнне гэтых лічбаў – культавы сімвал неанацызму). Знайсці і пакараць праварадыкалаў не змаглі. Пасля гэтых інцыдэнтаў узмацнілася прапускная сістэма на трыбуны стадыёнаў. Сёння пад час матчаў беларускага чэміпіянату прадстаўнікі праваахоўных службаў здымаюць на відэа сектары стадыёну, а пропуск на спартыўны аб'ект дазваляецца праз спецыяльную браму-металашукальнік і пасля асабістага дагляду [6].

Дарэчы, гісторыя з партрэтам Геса далёка не адзіны інцыдэнт, звязаны з экстрэмісцкай дзейнасцю футбольных фанатаў клубу «Дынама» Мінск. У 2009 годзе Беларуская федэрацыя футбола забараніла блакітна-белым вывешваць транспарант з надпісам «Дынамаўцы – хлопцы з белаю скурай і блакітных крывей». Футбольныя функцыянеры палічылі, што надпіс мае элементы абразлівага характару. Аднак банер таго самага зместу нечакана з'явіўся 19 лютага 2011 года ў Іспаніі, дзе ўжо гандбольны клуб «Дынама» Мінск гуляў матч Лігі чэмпіёнаў з мясцовай камандай BM «Valladolid». Гасцявы матч трансляваўся па тэлеканале АНТ. Замежны аператар ухапіў план з некалькімі дынамаўскімі фанатамі, якія трымалі ў руках той самы расісцкі банер [6].

**Заключэнне**

Шырока зразумелае паняцце сацыяльнага і культурнага капіталу шчыльна звязваецца з сучаснай спартыўнай дзейнасцю. Справа датычыцца, перш за ўсё, зменаў у самасвядомасці насельніцтва да людзей з іншых краінаў, асабліва калі гэта мігранты з па-за еўрапейскіх краінаў. Большасць грамадзянаў з дзяржаваў Еўропы часам нават не прыхоўваюць сваіх расісцкіх і шавіністычных поглядаў пад час правядзення масавых мерапрыемстваў, у тым ліку, калі яны знаходзяцца на стадыёне. Негатыўныя адносіны да іншаземцаў перадаюцца праз паводзіны агрэсіўна настаўленай моладзі, якая заўсёды шукае розныя накірункі, каб выпусціць сваю энэргію. Спартоўцы-мігранты звычайна самі ствараюць свой асабісты пераважна не самы прывабны імідж. Яны па-большасці не валодаюць вялікімі ведамі пра культуру і традыцыі краіны перасялення, не вучаць мову, у іх маецца недахоп адукацыі і г.д. Апрача таго, мігранты адбіраюць месцы працы ў прадстаўнікоў тытульнай нацыі. У кожнай іншай галіне прафесійнай дзейнасці колькасць мігрантаў не была б настолькі бачнай, але толькі не ў выпадку спорта, якому надаецца ўвагі ў медыях нават больш чым ён часам гэтага заслугоўвае. Практычна кожны крок спартоўца, ягоныя заробкі, паводзіны на стадыёне і па-за ім разглядаюцца настолькі пільна як нідзе ў іншай сферы сацыяльнай актыўнасці.

На заканчэнне неабходна падкрэсліць, што спорт у сучасны перыяд выконвае надзвычай важную ролю ў працэсе змены самой сутнасці сацыяльнага і культурнага капіталу. Негатыўныя вынікі спартыўнай дзейнасці ў шмат якіх выпадках ствараюць небяспеку ў адносінах паміж рознымі нацыянальнымі групамі. Спорт часам інспіруе сацыяльныя выбухі, выклікае негатыўныя эмоцыі, вядзе да дэвіяцыяў у сацыяльных паводзінах. Спартыўныя мерапрыемствы вялікага фармату практычна заўсёды звязаныя з павялічанай рызыкай канфрантацыі.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Доклад о развитии человека 2010. Реальное богатство народов: пути к развитию человека / Пер. с англ.; ПРООН. – М. : Изд-во «Весь Мир», 2010. – С. 211–214.

2. http://archiwum-ukie.polskawue.gov.pl/www/serce.nsf/0/4D8C348FA56A0134C125731C0027E2AC?Open&RestrictToCategory. – Дата доступу: 22.08.2011.
3. http://footballforall.org.ua/?p=227. – Дата доступу: 22.08.2011.
4. http://forum.pressball.by/viewtopic.php?t=65321. – Дата доступу: 19.08.2011.
5. http://krzysztofkucharski.wordpress.com/2011/05/01/rasizm-w-pilce-francuskiej/. – Дата доступу: 22.08.2011.
6. http://news.tut.by/society/246512.html. – Дата доступу: 19.08.2011.
7. http://sport.gadu-gadu.pl/5590686069504557394/uefa-przerazona-euro-2012-to-bedzie-rasistowski-turniej. – Дата доступу: 22.08.2011.
8. http://www.pressball.by/lenta.php?p=1&id=90489. – Дата доступу: 19.08.2011.
9. http://www.realmadrid.pl/index.php?co=aktualnosci&id=10390. – Дата доступу: 22.08.2011.
10. http://www.unic.un.org.pl/aktualnosci.php?news=1530&wid=18&druk=1. – Дата доступу: 22.08.2011.
11. Kłoskowska, A. Kultura masowa. Krytyka i obrona / A. Kłoskowska. – Warszawa : PWN, 1983. – 493 s.
12. Sztompka, P. Socjologia. Analiza społeczeństwa / P. Sztompka. – Kraków : Znak, 2002. – 653 s.

Дадатак

Сімволіка некаторых лічбаў і літараў, якія выкарыстоўваюцца на стадыёнах экстрэмісцкімі групоўкамі футбольных фанатаў:

18 = 1 і 8 – літары лацінскай абэцады – AH, якія азначаюць Адольф Гітлер (Adolf Hitler) і выкарыстоўваюцца міжнароднай тэрарыстычнай неагітлераўскай арганізацыяй;

28 = 2 і 8 – літары лацінскай абэцады – BH, якия азначаюць «Кроў і Гонар» (Blood & Honour), неанацысцкі дэвіз і назва расісцкай арганізацыі;

88 = 8 і 8 – літары лацінскай абэцады – HH, якия азначаюць «Heil Hitler»;

14 = чатырнаццаць словаў – дэвіз расісцкіх тэрарыстаў амерыканскай групы «The Order» («Парадак»).

Сімволіка літар:

KKK = Ku Klux Klan – амерыканская расісцкая, антысяміцкая і антыкаталіцкая арганізацыя;

WP = «White Power» («Белая Сіла» – лозунг Ku Klux Klan і расісцкіх скінхэдаў;

NF = Nazi Front, National Front – фашысцкая арганізацыя;

BH = Blood & Honour («Кроў і Гонар») – назва расісцкай арганізацыі;

NS = Нацыянальны сацыялізм – палітычная дактрына Адольфа Гітлера;

*У дадатку былі выкарыстаныя элементы некаторых навучальных матэрыялаў, якія былі распрацаваныя Польскім футбольным саюзам, а таксама таварыствам «Nigdy Więcej».*

***Lukievič U.*** **Deviational Behaviour in Sports: Philosophy, Essence and Danger of Football Fanaticism**

Modern sports in the system of a globalized society represent a specific phenomenon which influences the formation of social relations of people, their culture, make a concept basis «the social capital». At the same time deviational behaviour is widely spread in sports, there are regular displays of racism and xenophobia, discrimination in its most different forms. On the example of the behaviour of football fans the author analyzes philosophical aspects of dehumanize tendencies in sports, their essence and danger to the social environment.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 01.02.2012